■ Экслібрыс «Звязды»

«ЖЫЦЦЁ — НЕ РУКАПІС»

Сяргей Рублеўскі. Мамін шэпт пад абразамі: эсэ, мініяцюры, пісьмы. — Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2016. — 240 с.

Пагаджуся з аўтарам: жыццё складана параўнаць з рукапісам. У ім нельга перапісаць раздзел, выкрасліць радок, нават слова паправіць ці, як казаў Уладзімір Караткевіч, «і коскі не зрушыць». Толькі тут гаворка не пра надзвычайную прынцыповасць аўтара, а пра няўмольнасць лёсу і немагчымасць адгарнуць назад пражытыя старонкі.

Але з іншага боку, увасобленыя ў літаратуры пуцявіны жыцця могуць-такі стаць рукапісам — дзённікам, успамінамі, лістамі да родных і блізкіх. Іх можна захаваць, зберагчы, замарозіць на пэўны час, нават навечна. І такія родныя, знаёмыя з дзяцінства пахі свежага сена, шкіпінару, смак клёцак, кропу, кмену зноў ажывуць, хай нават толькі ў памяці ці ва ўяўленні чытача.

Эсэ, мініяцюры, што склалі новую кнігу пісьменніка з Віцебшчыны Сяргея Рублеўскага, вяртаюць нас у мінулае, на самы досвітак жыцця аўтара, у дзяцінства, якое будучы творца правёў на Лепельшчыне. Тады прыезд кінамеханіка на кані і паказ кіно ў хаце аднавяскоўцаў быў вялікім святам адразу для некалькіх вёсак; найлепшымі лекамі ад тэмпературы быў кампрэс са скрылёчкаў бульбы на лбе і націранне адмысловай самаробнай маззю са шкіпінарам, а самай смачнай стравай лічыліся бульбяныя клёцкі «з душамі» (кавалачкамі фаршу ці каўбасы). Для сучасных гарадскіх дзяцей такія словы, нават самі з'явы могуць падацца экзатычнымі. Але для чытачоў, якія нарадзілася ў канцы 1980-х і раней, эсэ Сяргея Рублеўскага — таксама ўспамін, але ўжо хутчэй пра дзяцінства ў вёсцы ў бабулі.

Тэксты з гэтай кнігі проста дыхаюць цеплынёй, шчырасцю і пяшчотай да роднай хаты і вёскі, да маці і блізкіх людзей. Аўтар не скупы на метафары, ён не саромеецца выказваць уласныя пачуцці, не баіцца здацца занадта эмацыянальным. Хіба крыху стрымліваецца, каб не пусціцца ў настальгію, не сплысці на хвалях успамінаў з сучаснасці ў мінуўшчыну.

Некаторыя эсэ з новай кнігі С. Рублеўскага ўжо можна было пабачыць на старонках «Звязды» (у крыху скарочаным варыянце), а таксама апублікаванымі ў іншых выданнях. Магчыма, таму аўтарскія вобразы здаюцца такімі знаёмымі і роднымі. А можа, справа не ў паўторы, а ў іх незвычайнасці і арыгінальнасці? Напрыклад, вобраз ідэальнай вясковай хаты і параўнанне столі ў ёй з небам маленства: «У ідэальнай хаце падлога і столь аднолькава чыстыя. Бывае, падлога становіцца нават чысцейшай за столь». Гэта здараецца, калі сама гаспадыня хаты ўжо не мае дастаткова сіл, каб узняць рукі ўгору ды самой вымыць столь. Але тады на дапамогу прыходзяць дзеці і ўнукі. Збіраючыся ў бацькоўскім доме напярэдадні вялікіх свят, яны не проста дапамагаюць бабулі, але «праяснiваюць неба свайго маленства».

А колькі цеплыні і любові аўтар надае вобразу ўласнай маці! Шкадуе, што яна ўжо не можа гадаваць карову і парсючкоў, нават ад курэй паступова адмовілася, а каб мець хоць нейкі карысны занятак на роднай сялібе, нават стала апекавацца чмялямі, што пасяліліся ў апусцелым хляве... І, як гэта часта бывае з людзьмі, якія ўсё жыццё пражылі ў вёсцы, пераехаўшы да сына ў горад, яна так і не звыклася з новым ладам жыцця, так і не знайшла занятку ў кватэры...

Вельмі цікавае і ліставанне пісьменніка з маці. Ёй ён пісаў лісты амаль усё жыццё. У прадмове да падборкі пісьмаў Сяргей Рублеўскі піша, што не адразу зразумеў каштоўнасць матуліных допісаў, многія з іх незваротна страчаныя, але многія і ацалелі, акуратна складзеныя ў стосікі ў шуфлядзе працоўнага стала. Менавіта іх мы можам пачытаць цяпер. А таксама паглядзець «вясковыя карцінкі», якія бабуля малявала для ўнучак (дочак аўтара), каб пацешыць малых доўгімі зімовымі вечарамі. Гэтыя выявы хоць і простыя, наіўныя, але паказваюць талент, сціплыя памкненні звычайнай вясковай жанчыны.

Думаецца, гэтая кніга прыцягне ўвагу многіх беларусаў. Тут намаляваны вобразы аднавяскоўцаў Сяргея Рублеўскага, людзей, якія ўжо назаўсёды адышлі ў вечнасць; адлюстраваны прадметы побыту і завядзёнкі, што становяцца музейнымі прадметамі і ператвараюцца ў мёртвыя згадкі. Тут гаспадараць сціпласць, спакой, святасць і непахіснасць простай вясковай хаты. Светлай — як само неба, адвечнай — як само жыццё.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

СЁННЯ

Месяц

Апошняя квадра 29.05–04.06. Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Аляксея, Цімафея.*
К. *Марыяны, Пятра.*

Сонца	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.43	21.33	16.50
Віцебск —	4.25	21.30	17.05
Магілёў —	4.33	21.23	16.50
Гомель —	4.39	21.10	16.31
Гродна —	5.00	21.46	16.46
Брэст —	5.10	21.38	16.28

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

2 ЧЭРВЕНЯ

1840 год — створаны тэатр Дуніна-Марцінкевіча. Гэта быў першы беларускі нацыянальны тэатр сучаснага тыпу, які аб'яднаў усе віды сцэнічнага мастацтва — драматычны, музычны, вакальны і танцавальны. Быў цэнтрам дэмакратычнай культуры, увабраўшы традыцыі народнага сцэнічнага мастацтва. Арганізаваны В. Дунінам-Марцінкевічам. Існаваў у 40-50-х гадах XIX ст. У трупу тэатра ўваходзілі сам пісьменнік Вікенцій Іванавіч, члены яго сям'і, знаёмыя, удзельнічалі таксама вучні яго школы і сяляне. Пастаноўкі прымяркоўвалі да свят і ўрачыстых дзён. Спецыяльна для гэтага драматург пісаў новыя камедыі. У тэатры былі пастаўлены спектаклі «Рэкруцкі набор» і «Ідылія». Дзень пастаноўкі оперы «Ідылія» ўпісаны залатымі літарамі ў гісторыю беларускага тэатра, усёй беларускай нацыянальнай культуры. Тэатр Дуніна-Марцінкевіча садзейнічаў станаўленню і развіццю прафесійнага тэатральнага мастацтва ў Беларусі.



1904 год — нарадзіўся Джоні Вайсмюлер, амерыканскі плывец, пяціразовы чэмпіён Алімпійскіх гульняў, кінаакцёр. Сусветную славу і фінансавы поспех яму прынеслі не толькі спартыўныя дасягненні. Джоні Вайсмюлер зняўся ў 16 фільмах пра Тарзана. Яго агульныя ганарары за гэтыя фільмы склалі 2 мільёны долараў.

1956 год — 60 гадоў таму нарадзіўся (г. Чашнікі) Віктар Анатолевіч Вараб'ёў, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук, прафесар. У 1978 годзе скончыў БДУ. Выкладаў у Беларускай сельгасакадэміі, з 2004-га — у Беларускім эканамічным універсітэце. Аўтар навуковых прац па праблемах дзяржаўнага рэгулявання эканомікі, аграрнай палітыкі і эфектыўнасці размяшчэння вытворчых рэсурсаў.

Было сказана

Алесь ЗВОНАК, паэт:

Вер часу: глупства мудрых не скасіла,
Са сцежкі яснай зайздрасць не звяла.

З прыгожай датай, з днём народзінаў
шчыра віншую дарагую пляменніцу
Наталлю Іванаўну СМОЛІЧ з Мінска!
Зычу ўсяго самага
найлепшага
на доўгія гады —
і дома, і на працы!
Т.І. Новік, г. Слуцк

Фестывальныя «фішкі»

З нагоды XI Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур у Гродне сабраліся на ўжо традыцыйны міжнародны пленэр 11 мастакоў з Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны.

Іх гасцінна сустрэлі гаспадары аграсядзібы «Каралінскі фальварак Тызенгаўза» Павел і Наталля Клімукі, а тэмай твораў удзельнікаў пленэру «Гродна — дарог скрыжаванне», які прысвечаны 20-годдзю фестывалю нацыянальных культур, стануць розныя «фішкі» горада над Нёманам і яго наваколля. Выстава гэтых палотнаў адкрыецца 4 чэрвеня ў Гродзенскай выставачнай зале.

А мясцовыя хлебапёкі для ўдзельнікаў і гасцей фестывалю падрыхтавалі шэраг новых кандытарскіх вырабаў, сярод якіх вялікія сувенірныя пернікі з выявай герба Гродна ў падарункавай упакоўцы, мучныя ласункі ў форме фестывальнай кветкі, сэрцайкаў і кольцаў. Эмблема фестывалю ўпрыгожыць пірагі і караваі.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

УСМІХНЕМСЯ

Каб развязаць сабе рукі на выхадныя, мы з жонкай пачынаем сварыцца яшчэ ў чацвер, у крайнім выпадку ў пятніцу. У суботу раніцай жонка з'язджае быццам да мамы, а я — быццам на рыбалку.

— Столькі слоў ёсць, каб апісаць жанчыну, якая не хоча сексу: халодная, фрыгідная, ледзяная... Але ці можаш ты успомніць хоць бы адно слова, якое апісвае мужчыну, які не хоча сексу?

— Мёртвы?..

Маленькая парада. Калі запраўляеце картрыдж першы раз у жыцці, як я, пачынайце з парашку жоўтага колеру — ён лягчэй за ўсё адмываецца са стала і шпалер.

Малюнак Пятра КОЗІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2171.

Нумар падпісаны ў 19.30 1 чэрвеня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12